# ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА АКАДЭМІКА-САКРАТАРА АДДЗЯЛЕННЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК І МАСТАЦТВАЎ ЧЛЕНА-КАРЭСПАНДЭНТА НАН БЕЛАРУСІ А. А. КАВАЛЕНІ ЎДЗЕЛЬНІКАМ НАВУКОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

Шаноўныя гаспадары навуковага форуму
Ларыса Аляксандраўна,
Наталля Пятроўна,
Сяргей Яўгенавіч!

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!

Прыміце самыя лепшыя пажаданні ад вучоных-гуманітарыяў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сёння ў нас юбілейная навуковая сустрэча, якая праходзіць у няпросты перыяд развіцця беларускага грамадства. Вядома, што кожная новая сустрэча вучоных павінна дапамагаць высвятляць многія праблемы гісторыі міждзяржаўных адносін, пытанні грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўна-культурнага жыцця грамадства. Зразуме-

ла, толькі аб’ектыўнае асвятленне гістарычных падзей з’яўляецца важнейшым фактарам кансалідацыі грамадства, умацавання міжканфесійнага і міжнацыянальнага ладу і, вядома, паспяховага развіцця беларускай дзяржаўнасці. Для беларусаў і нашых замежных сяброў 2021 год – гэта год яднання беларускага народа і 80-годдзя трагедыі пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Перад вучонымі нашай краіны шмат задач, каб з найбольшай дакладнасцю асвятляць многія складаныя старонкі мінулага беларускага народа, у тым ліку і адстойваць праўду аб укладзе савецкага народа ў разгром нацысцкай Германіі і, вядома, паспяховага будаўніцтва сумеснага еўрапейскага дома.

Хачу пажадаць усім удзельнікам навуковага форуму здароў’я, дабрабыту, плённай тварчасці і багатых навукова-даследчых вынікаў!

Шаноўныя ўдзельнікі канферэнцыі!

Некалькі слоў пра арганізацыю навукова-даследчай работы па праблеме беларуска-германскага супрацоўніцтва. Вядома, ёсць цікавыя напрацоўкі, аб чым яскрава сведчыць традыцыйнае правядзенне нашых сумесных форумаў. Сёння, як ужо адзначалася, мы праводзім 20-ю сустрэчу. Значная ўвага надаецца праблемам асэнсавання Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

На жаль, у наш час робіцца шмат, каб дыскрэдытаваць Вялікую Перамогу савецкага народа над нацысцкай Германіяй. Разгорнута нябачная раней фальсіфікацыя ваенных падзей, з’явілася нямала «шукальнікаў праўды», якія імкнуцца выяўляць і адкрываць толькі негатыўныя факты ваеннай гісторыі, перабольшваючы, а то і выдумляючы і падтасоўваючы розныя падзеі і факты, ствараючы розныя небыліцы. Уяўляецца, што наваяўленыя «даследчыкі», асабліва ангажаваныя публіцысты, многія з якіх, несумненна, маюць сваяцкія сувязі з тымі, хто пацярпелі паражэнне і прайгралі вайну, з былымі калабарантамі і здраднікамі, якія зыходзячы з уласнай духоўна-псіхалагічнай крывадушнасці працягваюць брудную справу, імкнучыся ганьбіць гераізм і самаадданасць савецкіх людзей.

Калі раней асобныя, найбольш агрэсіўныя антысаветчыкі спрабавалі абвінавачваць Савецкі Саюз у распальванні Другой сусветнай вайны, то сёння прымаюцца адпаведныя рэзалюцыі на міждзяржаўным узроўні. Вядома, што Парламенцкая асамблея Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ), якая праходзіла ў Вільнюсе з 29 чэрвеня па 3 ліпеня 2009 года, прыняла дэкларацыю, якая складаецца з 28 рэзалюцый. У рэзалюцыі “Уз'яднанне падзеленай Еўропы: заахвочванне праваў чалавека і грамадзянскіх свабод у рэгіёне АБСЕ ў XXI стагоддзі” адзначаецца, што ў “многих странах, в том числе в странах с устойчивыми демократическими традициями, гражданские свободы вновь подвергаются опасности, нередко в связи с принятием мер по борьбе с так называемыми «новыми угрозами», напоминая об инициативе Европейского парламента объявить 23 августа, т.е. день подписания 70 лет назад пакта «Риббентроп–Молотов», общеевропейским днем памяти жертв сталинизма и нацизма во имя сохранения памяти о жертвах массовых депортаций и казней”[1].

---

[1] Вильнюсская декларация парламентской ассамблеи ОБСЕ и резолюции восемнадцатой ежегодной сессии. Вильнюс, 29 июня – 3 июля 2009 года. С. 53–55.

Як бачна, у рэзалюцыі адзначаецца, што Савецкі Саюз нараўне з Германіяй нясе адказнасць за развязванне Другой сусветнай вайны. Прапаноўвалася аб'явіць 23 жніўня агульнаеўрапейскім днём памяці ахвяр сталінізму і нацызму. Аднак на гэтым палітычныя лідары Еўрасаюза не супыніліся. Праз дзесяць гадоў, 19 верасня 2019 года Еўрапейскі парламент зноў прыняў рэзалюцыю, у якой падкрэслівалася, што "80 гадоў таму, 23 жніўня 1939 г., камуністычны Савецкі Саюз і нацысцкая Германія падпісалі Дагавор аб ненападзе, вядомы як Пакт Молатава–Рыбентропа, і яго сакрэтныя пратаколы, падзяліўшы Еўропу і тэрыторыі незалежных дзяржаў паміж двума таталітарнымі рэжымамі і згрупаваўшы іх у сферы інтарэсаў, што падрыхтавала грунт для пачатку Другой сусветнай вайны"[1].

Як бачна, некаторыя палітычныя сілы Еўропы, асабліва младаеўрапейцы, імкнуцца перапісаць Нюрнберг, які вынес свой прысуд тым, хто распальваў вайну. Па сутнасці, гэта рэвізія вынікаў Другой сусветнай вайны, робіцца чарговая спроба рэабілітаваць сапраўдных вінаватых і памагатых у развязванні сусветнай вайны. Нагадаем, што менавіта палітычныя эліты краін-падпісантаў гэтай рэзалюцыі выступілі на баку нацызму і прымалі актыўны ўдзел у баявых дзеяннях, знішчалі мірнае насельніцтва, палілі вёскі, руйнавалі мірнае жыццё савецкіх людзей. Сёння некаторыя забываюць, што ў ваенным паходзе супраць СССР разам з Германіяй выступіла Венгрыя, Румынія, Фінляндыя, Славакія і Італія. Іх войскі налічвалі каля 870 тысяч чалавек, 42 разліковыя дывізіі, звыш 6600 гармат і мінамётаў, 400 танкаў і 960 самалётаў. Усяго на баку Германіі ваявала каля 2 мільёнаў чалавек з 15 краін Еўропы. Прычым многія з іх з'яўляліся добраахвотнікамі, з якіх былі створаны нацыянальныя фарміраванні:

«Блакітная дывізія» – Іспанія;

«Валонія» – у складзе дывізіі былі французскія, іспанскія і валонскія добраахвотнікі,

«Багемія і Маравія» – чэхі з Маравіі і Багеміі;

«Вікінг» – добраахвотнікі з Нідэрландаў, Бельгіі і Скандынаўскіх краін;

«Дэнемарк» – датчане;

«Лангемарк» – фламандскія добраахвотнікі;

«Нордланд» – галандскія і скандынаўскія добраахвотнікі;

«Галічына» – украінцы.

Дарэчы, многія з іх пакінулі чорны след на акупіраванай тэрыторыі Беларусі[2]. Прывядзём яшчэ адзін прыклад: у бітве пад Сталінградам Чырвоная армія разграміла не толькі германскія войскі, але і дзве румынскія, адну італьянскую і адну венгерскую арміі[3].

---

[1] https://ru-polit.livejournal.com/19280948.html.

[2] Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945. Энцыклапедыя. – Мінск 1990. С. 6.

[3] Разгром врага под Сталинградом [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://en-cyclopedia.mil.ru/files/VOV/tom3/VOV_Vol3_372-426_Chap7.pdf.

Сёння руйнуюцца помнікі савецкім воінам, якія вызвалілі краіны Еўропы ад карычневай чумы. Прасцей за ўсё, што адбываецца ў краінах Еўропы, спісаць на канкрэтнага нягодніка ці адмарожаных маргіналаў, чым убачыць мэтанакіраваную палітыку Еўрасаюза. Ужо ў названай рэзалюцыі Еўрапарламента ад 19 верасня 2019 года прапануецца барацьба з таталітарызмам, ачыстка тэрыторыі сваіх дзяржаў Еўрасаюза ад помнікаў савецкім воінам. З гэтай нагоды Еўрапарламент «выражает обеспокоенность по поводу продолжающегося использования символов тоталитарных режимов в публичном пространстве и в коммерческих целях и напоминает, что некоторые европейские страны запретили использование нацистских и коммунистических символов…». У 18 параграфе дакумента падкрэслена: тое, што «в некоторых государствах-членах памятники и мемориалы, посвященные тоталитарным режимам, по-прежнему остаются в общественных местах (парки, площади, улицы и т. д.), подготавливает почву для искажения исторических фактов о последствиях Второй мировой войны и для пропаганды тоталитарной политической системы»[1].

Як бачна, вельмі складана аналізаваць рашэнне парламентарыяў з пункту гледжання гістарычнай навукі. Еўрапейскія лідары прызвалі бурыць помнікі воінам-вызваліцелям, каб яны не напаміналі еўрапейскай грамадскасці аб тых, хто вызваліў Еўропу ад карычневай чумы.

На нашым навуковым форуме сёння было б карысным разгарнуць размову і па праблеме стаўлення германскіх палітычных колаў і германскіх спецслужб да дзейнасці Фабіяна Акінчыца, Канстанціна Езавітава, Васіля Захаркі, Радзіслава Астроўскага, Івана Ермачэнкі, Міхася Ганько і іншых прадстаўнікоў беларускага ваенна-палітычнага калабарацыянізму. Важна, выкарыстоўваючы арыгінальныя архіўныя крыніцы, зразумець ацэнку германскімі палітыкамі дзейнасці беларускіх калабарацыяністаў. На жаль, у нас слабая архіўная база дакументальных крыніц, у якіх адлюстравана дзейнасць германскіх спецслужб і нямецкіх палітыкаў у адносінах да будучага акупіраваных тэрыторый.

З гэтай нагоды было б карысным апублікаваць зборнік дакументаў, якія прымаліся германскімі ўладамі ў адносінах да будучага Беларусі, вядома, не прапагандысцкія заявы, а тыя, што складалі сутнасць акупацыйных мерапрыемстваў па абязлюджванні беларускай зямлі. Зразумела, нас цікавяць вытокі арганізацыі карных аперацый, іх ідэйныя натхняльнікі. Што магло здарыцца, каб у сярэдзіне XX стагоддзя спецыяльна спальваліся тысячы населеных пунктаў? Што адбывалася ў галовах тых, хто здзяйсняў гэтыя жудасныя вар'яцтвы?

Мае асабістыя навуковыя даследаванні дазваляюць сцвярджаць, што германскія палітыкі бачылі ў калабарацыяністах расходны матэрыял, які выкарыстоўваўся для вырашэння галоўнай палітычнай мэты – разгрому СССР.

---

[1] Корнеев, В. Еврототалитаризм и поджигатели войны [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://istoriki.su/istoricheskie-temy/lzheistoriya/lzeistoriya_dokumentalnyye_istochni-ki/900-evrototalitarizm-ipodzhigateli-voyny.html

Прывяду толькі два прыклады. Вясной 1943 года, калі ўжо была праведзена маштабная арганізацыйная работа па стварэнні Саюза беларускай моладзі (СБМ), многія беларускія юнакі і дзяўчаты пабылі ў Германіі, дзе вывучалі вопыт дзейнасці Гітлерюганда, каб перанесці яго на беларускае маладзёжнае асяроддзе. Аднак на спецыяльнай нарадзе ў красавіку 1943 года адзін з кіраўнікоў германскіх спецлужб адзначыў, што ён не можа даць згоду наконт стварэння нацыянальнага маладзёжнага саюза. Для высвятлення пытання неабходна было звярнуцца ў Берлін, каб высветліць, наколькі палітычна мэтазгодна дзейнасць маладзёжнай арганізацыі, як яна будзе служыць вырашэнню палітычных мэт Германіі. У выніку спатрэбілася амаль два месяцы, каб атрымаць дазвол на стварэнне СБМ.

Другі момант. Сёння шмат размоў аб сімволіцы. Дык вось, у лістападзе 1943 года, а гэта, як вядома, быў час разгрому германскіх войск пад Арлом і Курскам, пачатак вызвалення тэрыторыі Беларусі, знішчэнне беларускімі патрыётамі В. Кубэ і прызначэнне на пасаду выконваючага абавязкі Генеральнага камісара Беларусі Готберга, у Рызе была праведзена спецыяльная нарада, дзе выпрацоўвалася германская палітыка, якая павінна была ажыццяўляцца на акупіраваных тэрыторыях Рэйхскамісарыята "Остланд". Выконваючы абавязкі Генеральнага камісара Беларусі Годберг рабіў вялікую справаздачу аб становішчы ў Генеральным камісарыяце Беларусі. Было паднята пытанне аб сімволіцы беларускіх калабарантаў. Разгарнулася спрэчка, якая закончылася катэгарычнай высновай Рэйхскамісара "Остланд" Лозе. Ён заявіў: ніякіх беларускіх гербаў, ні ў якасці конніка, ні ў кветцы васілька. Розмова можа ісці толькі аб эмблеме. Герб дазволіць калабарантам ставіць пытанне аб дзяржаўнасці. Вось і ўся сутнасць беларускай дзяржаўнасці, якую планавалі германскія агрэсары для беларускага народа, – быць расходным матэрыялам дзеля вырашэння геапалітычных мэт нацысцкай Германіі[1]. Як бачна, многія пытанні дзейнасці германскіх акупацыйных улад і іх добраахвотных хаўруснікаў патрабуюць больш дэталёвага асэнсавання.

Паважаныя калегі!

Нельга не заўважаць і таго, што палітычныя эліты ЗША і Еўрасаюза сёння разгарнулі актыўныя дзеянні па выцясненні Беларусі з гістарычнай прасторы цывілізацыйна-культурнага і палітычнага ўплыву славянскага свету. Робіцца шмат, каб дыскрэдытаваць і парушыць гістарычнае поле жыццядзейнасці нашых продкаў, а значыць, і наш сённяшні лёс. Прычым дзеля вырашэння геапалітычнага супрацьстаяння сёння ўсё больш шырока выкарыстоўваюцца інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, каб аказваць уплыў не толькі на фарміраванне дэструктыўнай грамадскай думкі праз сацыяльныя сеткі, але і прыняцце патрэбных палітычных рашэнняў. У сродках масавай інфармацыі насаджаецца ідэалогія спажывальніцтва, а паралель-

[1] Каваленя А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі.1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. – Мінск, 1999. С. 91–92.

на ў камерцыйных сетках прыгожымі колерамі малюецца «шчаслівае жыццё за акіянам». Робіцца шмат, каб падтрымліваць у душах людзей запал прагнасці, ілжывасці, ганарлівасці, невуцтва, якія фарміруюць у душах падрастаючага пакалення разбэшчанасць, негатыўнае стаўленне да грамадзянскіх і патрыятычных пачуццяў, абыякаваць да нацыянальна-дзяржаўных і духоўна-культурных традыцый народа.

Нельга не заўважаць таго факта, што рэакцыйныя сілы разгарнулі супраць Беларусі маштабнае процістаянне. У гэты адказны гістарычны момант вучоным неабходна не проста кансалідацыя, як нашым продкам у 1410 г. і ў 1941 гг., а аб'яднанне з усімі здаровымі сіламі Беларусі, каб не толькі выстаяць, а перамагчы, дасягнуўшы новага этапу сацыяльна-эканамічнага і духоўна-культурнага развіцця беларускага народа ў вянку славянскіх і еўрапейскіх народаў.

Для таго, каб паспяхова будаваць багатую і шчаслівую Беларусь, улада і вучоныя, творчая інтэлігенцыя, усе, для каго будучае краіны неабыякава, абавязаны стварыць у краіне атмасферу нецярпімасці, якая б не дазваляла прарастаць прагнасці, крывадушнасці, жорсткасці, ілжывасці, невуцтву і ўсім іншым заганам чалавека. У грамадскім асяроддзі неабходна выбудоўваць сацыяльна-грамадскія ўмовы для дзейснага фарміравання грамадзянскіх і патрыятычных якасцей падрастаючага пакалення.

Зразумела, што ў перыяд глабальнай інфарматызацыі чалавецтва намнога ўзрастае маніпулятыўная магчымасць не толькі фарміравання дэструктыўнай грамадскай думкі, але і разбуральнага ўплыву на рашэнні, якія прымае палітычнае кіраўніцтва краіны. Ва ўмовах разгорнутага геапалітычнага цывілізацыйнага супрацьстаяння вельмі важна, каб мы разам з вучонымі еўрапейскіх краін не толькі выступалі супраць разбуральнай сутнасці паліттэхналогій, а наадварот, стваралі ўмовы для палітычнай сацыялізацыі і развіцця дэмакратычных кампетэнцый большасці народа.

Жадаю ўдзельнікам навуковага форуму цікавых дыскусій і творчых дасягненняў.